# Выстаўкі, прысвечаныя Міжнароднаму комуністычнаму жаночаму дню

У галоўнай зале Дзяржаўнай бібліятэкі імені Леніна (Мінск) адкрыта літаратурная і фота-выстаўка, прысвечаныя 31-й гадавіне Міжнароднага комуністычнага жаночага дня—8 сакавіка. Тут выстаўлены кнігі Леніна, Сталіна, Крупскай, артыкулы Даларэс Ібаруры, матэрыялы аб жанчынах-Героях Совецкага Саюза, а таксама творы беларускіх пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, Э. Самуйлёнка аб жанчынах.

Такая-ж выстаўка арганізавана ў бібліятэках імені Горкага і імені Пушкіна.